**D.A. Romanov**
Tula L.N. Tolstoy State Pedagogical University
e-mail: kafrus@rambler.ru

## Moral values in the understanding of D.A. Granin

*Key words: moral axiology, journalism, national character, historical background, vocabulary.*

*The article highlights the position of D.A. Granin on key moral issues. Based on the material of one of the writer's early journalistic articles, «On Mercy» his original and versatile approach to the system of human moral principles is examined. Specific forms of the author's argumentation, principles for developing logical justifications for his position, and features of its linguistic design are identified.*

**Г.К. Семянькова**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: galina.semenkova@mail.ru
УДК [811.161.1’373.215+811.161.3’373.215]:81’37(476.5)

## НЕАФІЦЫЙНЫЯ НАЗВЫ ВОДНЫХ АБ’ЕКТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Ключавыя словы: онім, мікратапонім, мікратапанімія, семантыка, балота.*

*У артыкуле разглядаецца семантыка назваў водных аб’ектаў, што фіксуюцца на тэрыторыі Віцебскай вобласці.*

*Апісваюцца найменні з прыналежнымі прыметнікамі, утворанымі ад уласных імён; назвы, звязаныя з характарыстыкай глебы і спецыфікай выкарыстання тэрыторыі; мікратапонімы, якія апісваюць асаблівасць флоры і фаўны балот; найменні, што змяшчаюць характарыстыку колеру вады, і інш.*

*Папярэднія назіранні сведчаць аб тым, што прыметнік “чортаў” шырока выкарыстоўваецца ў неафіцыйнай мікратапаніміі Віцебшчыны ў назвах не толькі балот, але і іншых аб’ектаў – мастоў, камянёў.*

Як вядома, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь балоты займаюць сёмую частку ўсёй плошчы краіны. У Беларусі пад балотамі знаходзіцца каля 25 000 кв. км плошчы, што складае больш за 14% ад тэрыторыі ўсёй краіны [2]. Відавочна, што балоты з’яўляюцца адным з найважнейшых аб’ектаў рэальнасці для насельніцтва: асушаныя балоты становяцца землямі сельскагаспадарчага, ляснога, прамысловага выкарыстання, торф з балот ужываецца як паліва, угнаенне, падсцілка для хатняй жывёлы, дары

балот – ягады і грыбы – ужываюцца ў ежу, падчас войнаў балоты служаць месцам, дзе мясцовае насельніцтва хаваецца ад ворагаў і збірае сілы для барацьбы з ім. Вось чаму ў беларусаў спецыфічнае стаўленне да балот, не заўсёды зразумелае іншым.

У сувязі са сказаным лагічна, што значная частка мікратапонімаў, якія існуюць на тэрыторыі Віцебскай вобласці, уяўляе сабой назвы балот. Як вядома, носьбітамі мікратапонімаў, якія ўжываюцца, як правіла, у вусным маўленні, з'яўляюцца мясцовыя жыхары. На жаль, з часам назвы забываюцца і губляюцца, бо сыходзяць людзі, якія імі карыстаюцца. У сувязі з гэтым *актуальнасць* нашага даследавання з'яўляецца відавочнай. Мэта артыкула – выяўленне і апісанне семантыкі бытуючых на тэрыторыі Віцебскай вобласці назваў балот.

Прапанаваны артыкул выкананы ў рэчышчы навуковай тэмы кафедры беларускай і рускай філалогіі ВДУ імя П.М. Машэрава "Функцыянаванне сучаснай беларускай мовы ў вуснай камунікацыі і пісьмовым тэксце: сацыяльна-дзяржаўны, нацыянальна-культурны і краязнаўча-рэгіянальны параметры" на 2021–2025 гады (нумар дзяржрэгістрацыі 20210458 ад 31.03.2021).

Фактычны матэрыял быў сабраны ў вёсках Верхнядзвінскага, Віцебскага, Лепельскага, Шаркаўшчынскага раёнаў. Асноўнымі метадамі даследавання з'яўляюцца параўнальна-супастаўляльны, апісальна-аналітычны і метад сістэмнага аналізу.

Анамасты адзначаюць, што мікратапонімы ўзнікаюць і замацоўваюцца ў сувязі з рознымі фактарамі геаграфічнага, гістарычнага і сацыяльнага характару. Выкарыстоўваючы як аснову класіфікацыю, прапанаваную Я.М. Адамовічам [1], мы вылучылі наступныя семантычныя групы назваў балот, якія сустракаюцца на тэрыторыі Віцебскай вобласці:

1) мікратапонімы, што супастаўляюцца з імёнамі, прозвішчамі ці іншымі найменнямі людзей;

2) адзінкі, матываваныя прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі аб'екта;

3) найменні, утвораныя ад назваў жывёл і птушак;

4) мікратапонімы, узнікненне якіх абумоўлена расліннасцю краю.

Фактычны матэрыял дазволіў вылучыць групы, не названыя Я.М. Адамовічам: мікратапонімы, якія характарызуюць знешнія асаблівасці прадмета; назвы, звязаныя з падзеямі, што адбываліся на месцы балота.

Як вядома, у мікратапаніміі фіксуецца вялікая колькасць назваў, звязаных з чалавекам – заснавальнікам або першапасяленцам у той ці іншай мясцовасці, а таксама тым, хто меў пэўнае стаўленне да яе. У нашым матэрыяле да такіх адзінак намі былі аднесены наступныя: *Аніськава балота* (аграгарадок Камень Лепельскі раён), *Юрачкава балота* (там жа).

Зафіксаваны назвы, звязаныя з прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі аб'екта, сярод іх адзначым наступныя: *Кіслаўка* – балота

з кіслай глебай (аграгарадок Камень Лепельскі раён), *Лужкі* – балота, якое выкарыстоўваецца як сенакос (там жа).

На тэрыторыі Віцебшчыны бытуюць наступныя мікратапонімы, утвораныя ад назваў прадстаўнікоў фаўны: *Змяінае балота* – участак лесу, размешчаны сярод палёў на поўнач ад вёскі Сар'я (Верхнядзвінскі раён), у ім водзіцца шмат змей; балота мохавае, без вады, не замярзае; *Жураўлёва балота* – поле, на якім часта можна сустрэць жураўлёў (аграгарадок Камень Лепельскі раён).

Да найменняў, абумоўленых асаблівасцю раслiннасці, намі аднесены мікратапонім *Бярэзеліца* – балота побач з вёскай Весялова (Шаркаўшчынскі раён), у якім расце шмат бяроз.

Знешнія асаблівасці аб'екта пакладзены ў аснову наступных назваў балот: *Чорнае балота* – мае ваду чорнага колеру (аграгарадок Камень Лепельскі раён), *Іржавае* – балота з вадой карычневага колеру (там жа), *Чырвоны Мох* – балота з чырвонай вадой (там жа).

Існуюць назвы, звязаныя з пэўнымі падзеямі, што адбываліся на месцы балота (заўважана, што такія назвы маюць адмоўную канатацыю): *Гарэлае балота* – балота, якое калісьці гарэла (аграгарадок Камень Лепельскі раён), *Жалобіна* (параўн.: бел. *жало́ба* 'траур') (іншая назва – *Чортава месца*) – нізкае топкае месца ў лесе каля вёскі Падбярэззе (Віцебскі раён).

Па словах мясцовых жыхароў, раней на месцы *Жалобіна* было балота, у цэнтры якога размяшчалася возера. Невядомая сіла не падпускала нікога да возера. Бясстрашныя хлопцы не аднойчы спрабавалі дабрацца да яго, але, як толькі падыходзілі да балота, ім станавілася дрэнна, некаторыя гублялі прытомнасць ці засыналі вечным сном. Пасля вайны (50-я гады ХХ стагоддзя) у балота ўпаў самалёт (побач знаходзіўся ваенны аэрадром Журжава), аднак падысці да яго так ніхто і не змог ні па зямлі, ні з паветра. З часам самалёт праглынула багна.

Зараз возера зарасло, амаль высахла, але непраходная багна засталася. Мясцовыя жыхары імкнуцца не наведвацца туды, бо "лясун заблытае – і прападзеш", выйсця не знойдзеш, хоць недалёка чутны гул машын з дарогі і жывёлагадоўчага комплексу ў вёсцы. Шмат людзей знікла ў тым месцы, калі хадзіла ў лес і не магло абмінуць балота. Рэдка які мясцовы жыхар можа пахваліцца, што бачыў гэтае возера. Сярод мясцовых жыхароў існуе думка, што, зазірнуўшы ў ваду возера, чалавек можа ўбачыць свой лёс.

Папярэднія назіранні сведчаць таксама пра тое, што прыметнік *чортаў* шырока выкарыстоўваецца ў неафіцыйнай мікратапаніміі Віцебшчыны: ён зафіксаваны ў назвах не толькі балот, але і іншых аб'ектаў. Так, прыметнік сустракаецца ў назвах мастоў: *Чортаў мост* – мост праз рэчку Аршыца, які атрымаў сваю назву з-за таго, што з'яўляецца небяспечным, часта абрываецца [4, с. 174].

Многія неафіцыйныя назвы камянёў маюць у сваім складзе прыметнік *чортаў*:

*Чортаў камень* – неафіцыйная назва Талеркавага каменя надзвычай вялікага памеру ў аграгарадку Язна Міёрскага раёна. Яго надземная частка мае плоскую і адносна роўную форму. Існуе легенда, што пад ім схаваны скарб, пакінуты полацкім князем Усяславам Чарадзеем;

*Чортаў камень* – камень у вёсцы Вароніна Сенненскага раёна, аб’ект лічылі домам нячысціка, які быў здольны да кравецкай справы. Людзі клалі на гэты камень палатно і грошы, а на наступны дзень забіралі гатовае адзенне;

*Чортаў камень* – валун ружовага граніту, які размешчаны недалёка ад  возера Вялец у вёсцы Вялец Глыбоцкага раёна. На камені захавалася каля 30 ямак дыяметрам 5–6 см і глыбінёй каля 3 см. Паводле аднаго з паданняў, на камені скакаў і кружыўся чорт, а ямкі ўтварыліся ад яго пят;

*Чортаў камень* – самы вялікі валун у Беларусі, знаходзіцца ў вёсцы Горкі Шумілінскага раёна. Яго вышыня над зямлёй кладае каля 3 метраў, яшчэ мінімум 3 метры – пад зямлёю. Валун такую назву з-за сваіх вялікіх памераў [3, с. 171–172].

Такім чынам, даследаванне неафіцыйных назваў водных аб’ектаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці дазваляе зрабіць выснову, што такія мікратапонімы вылучаюцца разнастайнасцю ў семантычным плане: сярод іх фіксуюцца найменні з прыналежнымі прыметнікамі, утворанымі ад уласных імён, назвы, звязаныя з асаблівасцямі глебы і спецыфікай выкарыстання тэрыторыі, адзінкі, якія апісваюць адметнасць флоры і фаўны, онімы, што змяшчаюць характарыстыку колеру вады, і інш.

**Літаратура**

1. Адамовіч, Я.М. Мікратапанімічныя назвы / Я.М. Адамовіч. – Мінск: Вышэйшая школа, 1971. – 112 с.

2. Болота Беларуси – лёгкие Европы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://welcome-belarus.ru/bolota-belarusi-legkie-evropy.html/. – Дата доступу : 03.04.2024.

3. Драба, І.А. Назвы камянёў на тэрыторыі Віцебшчыны: семантычны аспект / І.А. Драба // XVI Машеровские чтения: материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 21 октября 2022 г.: в 2 т. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Е.Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2022. – Т. 2. – С. 170–172. – Рэжым доступу: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/35245/1/170-172.pdf. – Дата доступу: 03.04.2024.

4. Драба, І.А. Назвы мастоў на тэрыторыі Віцебшчыны: семантычны аспект / І.А. Драба // Молодость. Интеллект. Инициатива : материалы X Международной научно-практической конференции студентов и магистрантов, Витебск, 22 апреля 2022 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: Е.Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2022. – С.  182 – 183. – Рэжым доступу: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/38171/1/281-283.pdf. – Дата доступу : 03.04.2024.

5. Семянькова, Г.К. Лексіка-семантычныя групы мікратапонімаў Віцебшчыны / Г.К. Семянькова // Наука – образованию, производству, экономике : материалы 72-й Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 20 февраля 2020 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: И.М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2020. – С. 151 – 152. – Рэжым доступ : https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/20953/1/151-152.pdf. – Дата доступу : 03.04.2024.

6. Шклярык В.А. Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы. Мінск: Беларуская навука, 2019. – 196 с.

**H.K. Semiankova**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: galina.semenkova@mail.ru

## Unofficial names of water bodies on the territory of the Vitebsk region

*Key words: onym, microtoponym, microtoponymy, semantics, swamp.*

*The article examines the semantics of unofficial names of marshes existing in the territory of the Vitebsk region (Republic of Belarus).*

*Names with possessive adjectives formed from proper names are described; names related to the characteristics of the soil and the specifics of the use of the territory; microtoponyms describing the peculiarity of the flora and fauna of swamps; names containing characteristics of the color of water, etc.*

*Previous observations indicate that the adjective devil is widely used in the unofficial microtoponymy of Vitebsk region in the names of not only swamps, but also other objects – bridges, stones.*

**Т.П. Слесарева**
Витебский государственный университет имени П.М. Машерова
e-mail: slestp@yandex.ru

УДК: 821.161.1-31.09

## СЕМАНТИКО-ФУНКЦИОНАЛЬНЫЙ АСПЕКТ ЭПИТЕТОВ-КОЛОРАТИВОВ В ПОВЕСТИ БОРИСА ВАСИЛЬЕВА «В СПИСКАХ НЕ ЗНАЧИЛСЯ» И ВАСИЛЯ БЫКОВА «ЖУРАЎЛІНЫ КРЫК»

*Ключевые слова: эпитет, колоратив, цветовые ассоциации, символы, семантика цветообозначений.*

*В литературе слова-цветообозначения являются своеобразными символами, а каждый отдельно взятый колоратив занимает своё определённое место в цветовой картине художественного произведения.*

*Писатель, обращаясь к цвету, преследуют одну цель: с помощью слова, зрительного образа воздействовать на читателя.*

*В статье предпринята попытка рассмотреть семантику и функционирование прилагательных-колоративов через их сочетание с различными существительными в повести Б. Васильева «В списках не значился» и Василя Быкова «Жураўліны крык».*

Цветопись является одним из неотъемлемых элементов идиостиля писателя, помогает авторам раскрывать идею произведения, создавать определенный эмоциональный настрой, рисовать образы героев. Кроме того, прилагательные-колоративы представляют собой семантическое поле, изучение которого вносит вклад в системный анализ лексики в целом.